# УСЕ—НА КАМУНІСТЫЧНЫ СУБОТНІК!

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 14 (1126) Пятніца, 16 красавіка 1976 г. Цана 2 кап. Газета выходзіць з 1935 г.

**12 КРАСАВІКА АДБЫЎСЯ СХОД КАМУНІСТАЎ УНІВЕРСІТЭТА, НА ЯКІМ БЫЛІ АБМЕРКАВАНЫ ВЫНІКІ РАБОТЫ XXV З'ЕЗДА КПСС І ЗАДАЧЫ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, ЗАЦВЕРДЖАНЫ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА ВЫКАНАННЮ РАШЭННЯЎ XXV З'ЕЗДА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ.**

# ВЫКАНАННЕ РАШЭННЯЎ ПАРТЫІ—КЛОПАТ КОЖНАГА

## З ДАКЛАДА ПЕРШАГА САКРАТАРА МІНСКАГА ГАРКОМА КПБ ТАВ. У. А. ЛЯПЁШКІНА «ВЫНІКІ РАБОТЫ XXV З'ЕЗДА КПСС І ЗАДАЧЫ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА» І ВЫСТУПЛЕННЯЎ КАМУНІСТАЎ НА ПАРТЫЙНЫМ СХОДЗЕ УНІВЕРСІТЭТА



Усё жыццё і дзейнасць партыйных арганізацый, працоўных калектываў горада, як і ўсёй нашай вялікай Радзімы, праходзіць зараз пад дабратворным уздзеяннем натхняльных ідэй XXV з'езда КПСС, які азнаменаваў сабой новы гістарычны рубеж у развіцці нашага грамадства па шляху да камунізму і стаў падзеяй вялікага міжнароднага значэння.

Уся партыя, увесь наш народ, працоўныя брацкіх сацыялістычных краін, барацьбіты за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, усе, каму дарагія ідэалы міру і прагрэсу, выключна высока ацэньваюць Справаздачны даклад ЦК КПСС XXV з'езду, з якім выступіў Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі таварыш Л. І. Брэжнеў. Гэты праграмны па сваіму значэнню дакумент змяшчае важныя абагульненні і вывады па карэнных праблемах сусветнага развіцця і рэвалюцыйнага працэсу, эканамічнай і сацыяльнай палітыкі КПСС, усебаковага развіцця палітычнай сістэмы савецкага грамадства, партыйнага будаўніцтва, ідэйна-выхаваўчай работы партыі ва ўмовах развітога сацыялізму, уносіць важкі ўклад у тэорыю і практыку навукавага камунізму.

Вызначаныя з'ездам велічныя перспектывы стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму, удасканальвання грамадскіх адносін, выхавання новага чалавека, развіцця сацыялістычнага спосабу жыцця з новай сілай адлюстроўваюць бясспрэчныя перавагі сацыялістычнага ладу. Савецкія людзі цвёрда ўпэўнены ў тым, што здзяйсненне планаў дзесятай пяцігодкі забяспечыць далейшае ўмацаванне эканамічнага, навукова-тэхнічнага і абароннага патэнцыялу краіны, яшчэ большае ўзмацненне ролі і аўтарытэту СССР на міжнароднай арэне.

Міжнародная дзейнасць КПСС — справа ўсенародная. Імена таму ў адпаведнасці з рашэннямі XXV з'езда задачы гарадской партыйнай арганізацыі састаяць у тым, каб і ў далейшым выхоўваць працоўных у духу міжнароднай салідарнасці, актыўна развіваць нашы інтэрнацыянальныя сувязі.

З кожным годам становяцца шырэй і глыбей навуковыя, тэхнічныя, культурныя сувязі горада-героя Мінска з замежнымі краінамі. У цяперашні час нашы спецыялісты працуюць у 96 краінах свету, 22 навукова-даследчыя інстытуты і прамысловыя прадпрыемствы горада вядуць сумесную работу ў розных галінах навукі і тэхнікі з краінамі — членамі СЭУ, а таксама з ЗША, Англіяй, Францыяй, Швецыяй і іншымі.

**Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна з'яўляецца членам Міжнароднай асацыяцыі універсітэтаў; на працягу раду гадоў актыўна супрацоўнічае з Іенскім (ГДР), Сафійскім (НРБ), Люблянскім (СФРЮ), двума універсітэтамі Польскай Народнай Рэспублікі; нядаўна падпісан дагавор з універсітэтам горада Камагуэй Рэспублікі Куба. Вучоныя універсітэта ўдзельнічаюць у рабоце многіх міжнародных сімпозіумаў, навуковых канферэнцый.**

**На падрыхтоўчым факультэце прайшлі навучанне каля дзвюх тысяч юнакоў і дзяўчат з замежных краін. У цяперашні час займаецца больш 500 чалавек з 46 краін. Гэта выключна ганаровая і адказная місія для калектыву універсітэта. Рэктарат, партком, партыйныя, камсамольскія арганізацыі і кіраўнікі факультэтаў павінны ўдзяляць пастаянную пільную ўвагу гэтаму участку работы.**

Развіваючы інтэрнацыянальныя сувязі, прымаючы ўдзел у міжнародных мерапрыемствах, неабходна дабівацца, каб ва ўсіх без выключэння выпадках больш актыўна і аргументавана прапагандаваліся савецкі лад жыцця, поспехі камуністычнага будаўніцтва, вялікія перавагі сацыялізму, на практыцы пацвярджаліся духоўнае багацце і маральная чысціня савецкага чалавека.

У цэнтры ўвагі XXV з'езда КПСС знаходзіліся пытанні эканамічнага і сацыяльнага развіцця нашай краіны. Імена на іх рашэнне накіроўваюцца асноўныя намаганні партыі і народа. У Справаздачным дакладзе падведзены вынікі дзевятай пяцігодкі, дадзен глыбокі аналіз эканамічнай стратэгіі партыі, ахарактарызаваны асаблівасці новай пяцігодкі, вызначаны вузлавыя праблемы развіцця эканомікі на сучасным этапе.

У дакладзе Старшыні Савета Міністраў СССР таварыша А. М. Касыгіна былі дакладна акрэслены асноўныя напрамкі развіцця ўсіх галін народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады, канкрэтныя сацыяльна - эканамічныя задачы пяцігодкі, праблемы развіцця матэрыяльнай вытворчасці на аснове павышэння эфектыўнасці і якасці.

Вышэйшай мэтай эканамічнай палітыкі партыі быў і застаецца няўхільны ўздым матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа на аснове дынамічнага і прапарцыянальнага развіцця грамадскай вытворчасці, павышэнне яе эфектыўнасці, паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, росту прадукцыйнасці працы, усямернага паляпшэння якасці работы ва ўсіх звеннях народнай гаспадаркі. Дзесятая пяцігодка — гэта новы важны этап у стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму, дасканаленні грамадскіх адносін і фарміраванні новага чалавека, развіцці савецкага ладу жыцця.

У дзесятай пяцігодцы важныя задачы прадстаіць рашаць працоўным г. Мінска. Для гэтага ў нас створана добрая аснова. Заданне 1971 — 1975 гадоў прамысловасцю горада выканана датэрмінова, за чатыры з палавінай гады. Звыш плана дадзена Радзіме прадукцыі на 1 млрд. 800 млн. рублёў, 28,7 працэнта агульнага аб'ёму выпуску гатовых вырабаў да канца пяцігодкі склала прадукцыя са Знакам якасці.

Зроблена нямала, але прадстаіць зрабіць яшчэ больш.

XXV з'езд КПСС адзначыў велізарнае, усё ўзрастаючае значэнне вышэйшай школы ў развіцці народнай гаспадаркі, навукі і тэхнікі, у здзяйсненні планаў эканамічнага і культурнага будаўніцтва. Партыя праяўляе пастаянны клопат аб развіцці вышэйшай школы, яе далейшым дасканаленні. За мінулае пяцігоддзе ў нашай рэспубліцы адкрыты 3 новыя ВНУ і рад іх філіялаў, на 20 тысяч чалавек узрасла колькасць студэнтаў, якія ў іх навучаюцца. У г. Мінску пачалі работу інстытут культуры, інстытут павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук ВНУ краіны пры БДУ імя У. І. Леніна, выраслі новыя вучэбныя карпусы і студэнцкія інтэрнаты іншых ВНУ.

Хочацца асабліва адзначыць значныя якасныя змены, якія адбыліся ў вышэйшай школе за мінулыя гады. Расшырыліся маштабы і дыяпазон яе работы, умацавалася вучэбна-матэрыяльная база. Ва ўсіх ВНУ здзейснен пераход на работу па новых вучэбных планах і праграмах, у якіх паўней уліčаны навейшыя дасягненні навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Пачалася падрыхтоўка кадраў па раду новых спецыяльнасцей, уведзены новыя дысцыпліны, істотна ўзмоцнена выкладанне фундаментальных навук. ВНУ шырока аснашчаюцца тэхнічнымі сродкамі навучання, уключаючы электронна - вылічальныя машыны і канструкцыі, адбылося значнае папаўненне іх вучэбнай і навуковай літаратурай.

**Над рашэннем адказных задач, якія стаяць перад вышэйшай школай, мэтанакіравана і творча працавалі амаль паўтаратысячная партыйная арганізацыя, увесь прафесарска-выкладчыцкі састаў вядучай ВНУ рэспублікі—**

**(Працяг на 2-й стар.).**




Фота **А. Басава** і **В. Драчова.**

# ВЫКАНАННЕ РАШЭННЯЎ

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

універсітэта імя У. І. Леніна. Тут працуе больш 2 тысяч навукова-педагагічных супрацоўнікаў, у тым ліку 73 прафесары, дактары навук і 603 дацэнты, кандыдаты навук. За пяць гадоў супрацоўнікамі універсітэта абаронены 43 доктарскія і 23 кандыдацкія дысертацыі, падрыхтавана 14,5 тысячы спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі, навукі і культуры.

Значна ўмацавалася вучэбна-матэрыяльная база, на якую выдаткавана каля 10 млн. рублёў. За гэтыя гады створаны і паспелі ўжо набыць вядомасць навукова-даследчы інстытут прыкладных фізічных праблем, тры галіновыя і дзве праблемныя лабараторыі, даволі буйное спецыяльнае канструктарска-тэхнічнае бюро з доследнай вытворчасцю, адкрыты факультэт прыкладной матэматыкі і 12 новых кафедр. На службу вучэбнаму працэсу пастаўлены 4 камплекты сучасных электронна-вылічальных, 140 лічыльна-клавішных, 9 аналагавых, 40 лічбавых вылічальных машын, іншыя навучаючыя і кантралюючыя канструкцыі, абсталяваны дзесяткі лекцыйных залаў, вучэбных кабінетаў і лабараторый. Усё гэта, безумоўна, аб'ектыўна пашырае магчымасці для павышэння эфектыўнасці ўсёй вучэбна-выхаваўчай і навуковай дзейнасці калектыву універсітэта.

Наяўнасць магутнай матэрыяльна-тэхнічнай базы, вялікага атрада высокакваліфікаваных прафесарска-выкладчыцкіх кадраў, нарэшце, больш чым пяцідзесяцігадовы вопыт работы даюць аснову ставіць перад партыйнай арганізацыяй, рэктаратам універсітэта задачу—дабіцца ператварэння флагмана вышэйшай школы рэспублікі ў яе прызнаны навукова-метадычны цэнтр. Такое патрабаванне прама сфармулявана ў пастанове XIII пленума ЦК КПБ, і над яго выкананнем належыць працаваць з усёй настойлівасцю.

Рашэнне гэтай праблемы дазволіць значна ўдасканаліць вучэбны працэс, больш паспяхова выконваць галоўную задачу — лепш рыхтаваць маладых спецыялістаў.

Якасць вучэбнага працэсу ў ВНУ ў рашаючай ступені залежыць ад узроўню пастаноўкі метадычнай работы, авалодання кожным выкладчыкам эфектыўнымі формамі і метадамі навучання, сучаснымі прынцыпамі педагогікі і псіхалогіі, навуковымі асновамі педагагічнага майстэрства. Іменна гэты ўчастак, на наш погляд, з'яўляецца пакуль яшчэ слабым звяном вашай дзейнасці.

Калектыў універсітэта можа і павінен выступаць застрэльшчыкам у пастаноўцы і рашэнні раду актуальных праблем методыкі вышэйшай школы і павышэння на гэтай аснове якасці падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі. Наўрад ці можна прызнаць нармальным, што універсітэт практычна не падрыхтаваў кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў галіне педагогікі і псіхалогіі. Да ўдзелу і распрацоўкі гэтых праблем слаба прыцягнуты студэнты. Разам з тым вывучэнне і ўкараненне ў практыку новых форм і метадаў навучання як ніколі раней актуальна.

Узровень развіцця ўсіх галін народнай гаспадаркі ставіць да выпускніка ВНУ павышаныя сучасныя патрабаванні. Сёння мала даць студэнтам толькі пэўную суму ведаў — ім жа прадстаіць жыць і працаваць у дынамічным, імкліва ўзнаўляючымся свеце, удзельнічаць у вялікіх камуністычных пераўтварэннях. Неабходна, каб з першых дзён вучобы ў юнакоў і дзяўчат выхоўвалася працавітасць, уменне творча мысліць, арыентавацца ў нарастаючым патоку палітычнай і навуковай інфармацыі.

**Партыйны камітэт і рэктарат, пярвічныя партарганізацыі і дэканаты павінны дабівацца творчых адносін да сваіх абавязкаў кожнага супрацоўніка універсітэта, выхоўваць гэтыя якасці ў сваіх студэнтаў. Як падкрэсліў XXV з'езд КПСС, у рабоце зараз рэзка ўзрастае значэнне творчага фактару. Грандыёзныя планы дзесятай пяцігодкі патрабуюць сапраўды наватарскага падыходу да іх выканання ад рабочага і калгасніка, будаўніка і вучонага.**

Калі зыходзіць з гэтых высокіх патрабаванняў, якія вызначыў з'езд, належыць адзначыць, што ўзровень арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, падрыхтоўкі спецыялістаў ва універсітэце мае патрэбу ў значным паглыбленні і ўдасканаленні. Бо не сакрэт, што ў радзе выпадкаў навучанне студэнтаў вядзецца ў адрыве ад навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі, без уліку ўсіх аспектаў далучэння моладзі да стваральнай працы.

У паўсядзённай, пільнай увазе партыйных, камсамольскіх арганізацый, дэканатаў і кафедр маюць патрэбу павышэнне якасці ведаў студэнтаў, выпрацоўка ў іх адказных адносін да вучобы. Не можа задаволіць такое становішча, што толькі на стацыянары ў апошнюю экзаменацыйную сесію каля 700 чалавек атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Яшчэ горш абстаіць справа на вячэрняй і завочнай формах навучання, дзе ў зімовую сесію не паспявала адпаведна 16,1 і 18,4 працэнта.

У рашаючай меры вынікі вучобы залежаць ад свядомасці, арганізаванасці, пачуцця адказнасці і грамадзянскага абавязку кожнага студэнта. Патрэбна ўсямерна павышаць перш за ўсё адказнасць моладзі. Гэта факт. Аднак бясспрэчна і тое, што вучоба — гэта від вельмі складанай працы, якая патрабуе ад студэнта вялікай напружанасці і творчага падыходу, і разам з тым больш дзейснай дапамогі з боку выкладчыка, не фармальных адносін яго да сваіх абавязкаў, а клапатлівай індывідуальнай дапамогі.

Партыйны камітэт і рэктарат павінны трымаць пад неаслабным кантролем меры па значнаму паляпшэнню падрыхтоўкі педагагічных кадраў для школы, клапаціцца аб уздыме прэстыжнасці гэтай прафесіі, аб чым грунтоўна і на глыбока прынцыповай аснове ішла размова на XVII пленуме ЦК КПБ.

Універсітэт рыхтуе вялікі атрад спецыялістаў для школ рэспублікі. Трэба прама заўважыць, што па ўзроўню тэарэтычнай падрыхтоўкі большасць з іх адпавядае высокім патрабаванням да савецкага настаўніка, у многіх выпадках выгадна адрозніваецца ў гэтым плане ад выпускнікоў іншых ВНУ. Аднак многія не валодаюць неабходнай метадычнай падрыхтоўкай для выкладання ў школе, не могуць глыбока унікаць у псіхалогію навучэнцаў, аказваюцца бездапаможнымі перад навейшымі тэхнічнымі сродкамі і метадамі кабінетна-лабараторнай сістэмы навучання, доўга асвойваюць ролю класнага кіраўніка. Гэта значыць, адчуваецца істотны разрыў паміж тэарэтычнай, псіхолага-педагагічнай і метадычнай падрыхтоўкай.

Прычына такога становішча заключаецца перш за ўсё ў тым, што на радзе факультэтаў недастаткова ўлічваецца спецыфіка будучай прафесіі выпускнікоў, марудна ўкараняюцца навейшыя метады і сродкі навучання ў самім універсітэце. Асабліва гэта датычыцца гуманітарных факультэтаў. У сувязі з гэтым перад партыйным камітэтам і рэктаратам паўстае неадкладная задача ў бліжэйшы час арганізаваць падрыхтоўку выкладчыкаў па выкарыстанню навейшых сродкаў навучання, няўхільна дабівацца шырокага ўкаранення іх у вучэбны працэс.

**Важнай задачай партыйнай арганізацыі, рэктарата, прафесарска-выкладчыцкіх кадраў з'яўляецца арганізацыя навукова-даследчай работы. Кіруючыся рашэннямі XXIV з'езда КПСС і XXVII з'езда КПБ, калектыў універсітэта дабіўся прыкметнага павышэння тэарэтычнага ўзроўню і эфектыўнасці навуковых даследаванняў, паскарэння ўкаранення закончаных распрацовак у народную гаспадарку. Эканамічны эфект ад іх укаранення за дзевятую пяцігодку склаў 10 млн. 700 тысяч рублёў і роўны тром рублям на адзін рубель затрат. За гэты перыяд пададзены 372 заяўкі на вынаходніцтвы і адкрыцці, атрыманы 4 патэнты, выдана 195 манаграфій, некалькі дзесяткаў зборнікаў, падручнікаў і дапаможнікаў.**

У апошнія гады разам з планавымі дзяржаўнабюджэтнымі даследаваннямі ўсё больш пашыраюцца работы па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы. За пяць год аб'ём гаспадарча-дагаворных работ склаў каля 15 млн. рублёў. Заслугоўвае ўсялякага адабрэння стварэнне вучэбна-навукова - вытворчага аб'яднання універсітэта з ВТА «Інтэграл».

Значэнне навукова-даследчай работы ў ВНУ вызначаецца не толькі яе ўкладам у рашэнне тэарэтычных і прыкладных праблем, але і тым, наколькі яна ўплывае на ўдасканальванне вучэбнага працэсу, паляпшэнне падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. На нядаўна адбыўшымся сходзе актыву рэспубліканскай партыйнай арганізацыі, у прынятых на ім мерапрыемствах па выкананню рашэнняў XXV з'езда КПСС іменна на гэты бок справы звернута асаблівая ўвага. І гэта заканамерна. Вучоныя ВНУ павінны пастаянна ўзбагачаць вучэбны працэс навейшымі навуковымі дасягненнямі, будзіць у моладзі інтарэс да ўсяго новага, прагрэсіўнага, выпрацоўваць у яе навыкі даследчыка, арганічна спалучаць навуковую работу з вучэбным працэсам. У мерапрыемствах ЦК КПБ пастаўлена задача ўцягнуць у навукова-даследчую работу не менш 90 працэнтаў студэнтаў дзённай формы навучання. Як бачна, на гэтым участку прадстаіць зрабіць нямала, калі ўлічыць, што ў цяперашні час ва універсітэце да розных форм навукова-даследчай работы прыцягнута каля 75 працэнтаў студэнтаў.

Вызначаючы задачы ў галіне навуковых даследаванняў на дзесятую пяцігодку, калектыву універсітэта неабходна ў першую чаргу максімальна сканцэнтраваць свае намаганні на распрацоўцы найбольш важных, комплексных праблем. Партыйнаму камітэту і рэктарату належыць распрацаваць і здзейсніць на практыцы рад канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на стварэнне творчых калектываў вучоных, здольных рашаць складаныя задачы навукі, бо ў сучасных умовах у адзіночку ўсё цяжэй становіцца дасягаць прыкметных поспехаў. XXVIII з'езд Кампартыі Беларусі яшчэ раз указаў на неабходнасць накіроўваць на распрацоўку буйных, комплексных праблем намаганні нават не адной кафедры, а некалькіх; або, магчыма, аб'ядноўваць сілы не аднаго факультэта. Трэба сур'ёзна падумаць над рэалізацыяй гэтай ідэі, бо яна аб'ектыўна адлюстроўвае загад часу.

Хочацца адзначыць яшчэ адзін аспект у галіне навукова-даследчай дзейнасці. Гаворка ідзе аб тым, што ў мінулай пяцігодцы толькі 30 працэнтаў аб'ёму гаспадарча-дагаворных работ выканана па заказах розных галін народнай гаспадаркі нашай рэспублікі і Мінска. Не звужаючы геаграфію і дыяпазон сваіх навуковых інтарэсаў, належала б падумаць аб павелічэнні ўкладу універсітэцкіх кадраў у рашэнне буйных праблем, якія стаяць перад нашай рэспублікай. Месца для актыўнага прыкладання сіл тут абавязкова знойдзецца.

Сёння дарэчы, у прыватнасці, напомніць і аб тым, што калектыву універсітэта, адпаведна з мерапрыемствамі ЦК КПБ, прадстаіць актыўна заняцца распрацоўкай раду важных комплексных тэм па павышэнню эфектыўнасці ідэйна-выхаваўчай работы ў працоўных калектывах, планаў іх сацыяльна-эканамічнага развіцця, павышэння грамадска-палітычнай актыўнасці працоўных.

Моц нашага ладу — у свядомасці мас, таму выхаванне камуністычнай свядомасці, гатоўнасці, волі і ўменне будаваць камунізм партыя лічыць сваім пастаянным клопатам.

**Час патрабуе ад нас мэтанакіраванага дасканалення ідэйна-выхаваўчай работы. У жыццё ўступаюць новыя пакаленні. Расце адукацыйны і культурны ўзровень, інфармаванасць савецкіх людзей, абвастраецца барацьба двух ідэалогій. Усё гэта прад'яўляе павышаныя патрабаванні да нашай работы ў масах.**

**Рашаючым фактарам у паляпшэнні ідэйна-выхаваўчай дзейнасці партыйных арганізацый XXV з'езд КПСС вызначыў комплексны падыход да пастаноўкі ўсёй справы выхавання. Пад комплексным падыходам разумеецца забеспячэнне цеснага адзінства ідэйна-палітычнага, працоўнага і маральнага выхавання з улікам асаблівасцей розных груп працоўных.**

**У цэнтры ўсёй ідэйна-палітычнай работы партыя ставіць фарміраванне марксісцка-ленінскага светапогляду ў працоўных, выхаванне камуністычнай ідэйнасці, развіццё камуністычных адносін да працы, далейшае дасканаленне маральнага выхавання.**

Гэтыя задачы для ВНУ выключна актуальныя. Тут рыхтуюцца не проста спецыялісты народнай гаспадаркі, але адначасова і ідэйныя байцы нашай партыі, арганізатары палітыка-выхаваўчай работы ў калектывах. У дастатковай меры ўзброіць усіх сваіх выпускнікоў добрымі ведамі марксісцка-ленінскага вучэння, эфектыўных форм і метадаў палітычнай работы ў масах, за час вучобы выхаваць у іх першапачатковыя навыкі гэтай работы —надзвычай адказная задача партыйнай арганізацыі, кожнага камуніста, кожнага выкладчыка савецкай ВНУ.

Партыйнаму камітэту і рэктарату, пярвічным партарганізацыям, кіраўніцтву факультэтаў і кафедр з улікам высокіх патрабаванняў XXV з'езда КПСС неабходна перш за ўсё ўзяць пад неаслабны кантроль і абавязкова дабівацца арганічнага адзінства і няўхільнага ўзрастання ролі навучаючых і выхаваўчых функцый кожных заняткаў.

Належыць без прамаруджання на ўсіх кафедрах старанна разгледзець пытанне аб папаўненні вучэбнага матэрыялу па ўсіх прадметах новымі фактамі, жыватворнымі ідэямі і вывадамі XXV з'езда КПСС, прыкладамі самаадданай працы савецкага народа па ажыццяўленню велізарных прадвызначэнняў партыі. Гістарычныя рашэнні з'езда павінны пранізваць увесь вучэбна-выхаваўчы працэс.

Істотным чынам павінны быць дапоўнены планы пазавучэбнай ідэйна-выхаваўчай работы. Прычым трэба мець на ўвазе не колькасны рост мерапрыемстваў, а павышэнне эфектыўнасці кожнага з іх.

Самай пільнай увагі ўсёй партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый, кіраўніцтва універсітэта, факультэтаў, кафедр патрабуе работа з жыхарамі інтэрнатаў. У паляпшэнне быту студэнтаў укладваюцца вялікія сродкі; вырастаюць новыя прыгажуны-інтэрнаты, але парадкі ў іх, на жаль, паляпшаюцца марудна.

На рашучае выпраўленне становішча тут у першую чаргу павінен быць мабілізаван студэнцкі камсамольскі і прафсаюзны актыў. Як гаворыцца, лепш за гаспадароў ніхто не навядзе парадак у сваім доме. Аднак у значным, прынцыповым перагледзе мае патрэбу і пазіцыя ў гэтых адносінах часткі прафесарска - выкладчыцкага саставу. Не па графіку, не пасля напамінаў, а па загаду душы, з бацькоўскім клопатам патрэбна бываць у інтэрнаце, які на пяць год становіцца родным домам тысячам юнакоў і дзяўчат, ведаць іх умовы жыцця, настрой і інтарэсы.

**Партыйныя і камсамольскія арганізацыі ВНУ заклікаты павысіць ролю студэнцкіх будаўнічых атрадаў у працоўным і маральным выхаванні студэнтаў, паставіць справу такім чынам, каб кожны юнак і дзяўчына за час вучобы абавязкова адзін-два разы прайшлі загартоўку ў гэтай сапраўднай школе працоўнага жыцця. У святле гэтых патрабаванняў партыйнай і камсамольскай арганізацыям універсітэта прадстаіць яшчэ многае зрабіць.**

**У ідэйна-маральным станаўленні асобы маладога чалавека, будучага спецыяліста, выключна вялікая роля выкладчыка, духоўнага настаўніка моладзі. Выконваць гэтую ролю выкладчык павінен не толькі на лекцыях, семінарскіх занятках, калі нават яны праводзяцца на належным узроўні. Рабіць гэта ён заклікан кожным сваім дзеяннем і ўчынкам, глыбокай унутранай ідэйнасцю і перакананасцю, разуменнем дыялектыкі жыцця, шырокай эрудыцыяй, сціпласцю, высокай асабістай адказнасцю і працавітасцю.**

Выпускнікі універсітэта павінны мець значна лепш сфарміраваныя эстэтычныя густы, больш шырокія веды ў галіне ўсіх відаў мастацтва і культуры, быць у першых радах сапраўдных савецкіх інтэлігентаў. Лепш рашаць гэтыя праблемы — задача прафесарска - выкладчыцкага саставу. Вось чаму ўдумлівы падыход да няспыннага павышэння кожным з іх свайго ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню, пастаянны клопат аб іх высокім ідэйна-маральным абліччы і культурным узроўні, безумоўна, павінны быць прадметам асаблівага клопату партыйнай арганізацыі і рэктарата.

Ва універсітэце дастаткова вопытных і сталых кадраў для рашэння самых складаных задач. Трэба накіраваць усю энергію, волю партыйнага актыву, усіх камуністаў на барацьбу за высокі гонар калектыву універсітэта, які быў і па праву застаецца флагманам вышэйшай школы рэспублікі. Гарадскі камітэт партыі верыць у тое, што калектыў універсітэта заўсёды будзе застрэльшчыкам усяго новага, перадавога, што кожнаму члену універсітэцкага калектыву заўсёды будуць уласцівы высокая ідэйная сталасць і грамадска-палітычная актыўнасць, пастаянная накіраванасць на лепшую якасць работы і адказныя адносіны да свайго службовага абавязку. У авангардзе ўсіх добрых спраў, безумоўна, заклікаты быць камуністы.

На кожным этапе дзейнасць партыі напаўняецца новым зместам. Натуральна, таму, што новыя задачы, якія вызначыў XXV з'езд КПСС, патрабуюць і далей, на навуковай аснове ўдасканальваць формы і метады партыйнай работы. Важная ўмова поспе-

# ПАРТЫІ — КЛОПАТ КОЖНАГА

ху партыйнага кіраўніцтва, падкрэслівалася на з'ездзе, заключаецца ў ленінскім стылі работы, які прадугледжвае высокую патрабавальнасць да сябе і да іншых, выключае самазаспакоенасць, процістаіць любым праявам бюракратызму, фармалізму і суб'ектывізму.

**Партыйнаму камітэту універсітэта, партбюро факультэтаў належыць многае зрабіць для ўздыму арганізацыйна-партыйнай работы да ўзроўню высокіх патрабаванняў сённяшняга дня. Патрабуецца значна палепшыць кантроль і праверку выканання прынятых рашэнняў. Непараўнальна большае значэнне патрэбна надаць уважліваму вывучэнню і распаўсюджанню вопыту працы факультэцкіх партарганізацый, партыйных груп, інфармаванню партыйнага актыву і ўсіх камуністаў аб дзейнасці парткома, аб прымаемых ім рашэннях па выкананню крытычных заўваг камуністаў.**

Трэба палепшыць кіраўніцтва камсамольскай і іншымі грамадскімі арганізацыямі. Намаганні камсамольскіх арганізацый і груп патрэбна больш накіроўваць на рашэнне галоўнай задачы — выхаванне ў кожнага камсамольца свядомай дысцыпліны, адказных адносін да вучобы і грамадскіх спраў.

Партыйны камітэт і рэктарат універсітэта распрацавалі канкрэтныя мерапрыемствы, выкананне якіх забяспечыць далейшае паляпшэнне вынікаў работы калектыву па важнейшых напрамках у святле патрабаванняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ.

У дзесятай пяцігодцы намячаюцца шырокія перспектывы развіцця універсітэта. Прадстаіць пабудаваць новыя вучэбныя карпусы і інтэрнаты, намячаецца адкрыццё новых навукова-даследчых інстытутаў і буйных лабараторый, падрыхтоўка спецыялістаў па новых спецыяльнасцях, далейшае аснашчэнне сучаснымі сродкамі і дасканаленне вучэбна-выхаваўчага працэсу, значнае расшырэнне дыяпазону і павышэнне эфектыўнасці навукова-даследчай работы.

Усё гэта патрабуе зладжанай, мэтанакіраванай, творчай дзейнасці ўсяго калектыву. Няма сумнення ў тым, што партыйная арганізацыя універсітэта мабілізуе прафесарска-выкладчыцкія кадры, студэнтаў, усіх супрацоўнікаў на паспяховае рашэнне новых адказных задач, якія паставіў XXV з'езд нашай ленінскай партыі.

●

Пасля заканчэння даклада слова для выступлення ўзяў дэкан біяфака прафесар **А. Пікулеў.** Ён адзначыў, што ўзровень партыйнага кіраўніцтва непасрэдна залежыць ад таго, наколькі баявіта і ініцыятыўна працуюць партыйныя арганізацыі, якія складаюць аснову нашай партыі.

За апошнія гады ўзрасла роля партыйнай арганізацыі ў дасканаленні вучэбнага працэсу. У тэматыцы пасяджэнняў партбюро, партсходаў усё больш месца знаходзяць пытанні вытворчага характару: справаздачы асобных загадчыкаў кафедр аб пастаноўцы вучэбнай і навуковай работы, справаздачы асобных камуністаў. Больш канкрэтна сталі абмяркоўвацца пытанні навуковай работы. Партбюро факультэта стала больш удзяляць увагі кантролю за выкананнем прынятых рашэнняў. Трэба адзначыць, што да цяперашняга часу не вырашана пытанне аб павышэнні ролі партгрупоргаў на кафедрах.

Затым дакладчык звярнуў увагу на пытанне далейшага дасканалення партыйнага кантролю за дзейнасцю адміністрацыі. У рэкамендацыях Мінскай гарадской навукова-практычнай канферэнцыі па гэтаму пытанню, якая адбылася ў 1972 годзе, ёсць толькі самыя агульныя ўстаноўкі, якія не заўсёды можна выкарыстаць у рабоце на месцах. Відаць, зараз нам неабходны больш шырокія рэкамендацыі з улікам вопыту лепшых арганізацый.

Затым тав. Пікулеў спыніўся на перспектыўных праблемах дасканалення вучэбных планаў, матэрыяльна - тэхнічнага аснашчэння вучэбнага працэсу, на пытаннях набору студэнтаў і размеркавання выпускнікоў.

***

На трыбуне партыйнага сходу — сакратар партбюро гістфака **І. Марчанка.** У сваім выступленні ён звярнуў увагу камуністаў універсітэта на тыя вялікія якасныя і колькасныя змены, якія адбыліся ў апошні час у партарганізацыях БДУ. Гэта можна прасачыць і на прыкладзе партарганізацыі гістарычнага факультэта. **Зараз яна аб'ядноўвае 254 камуністы. У перспектыве да канца 1976 года на ўліку тут будзе каля 300 камуністаў. Сярод цяперашняга саставу партыйнай арганізацыі гістфака — 94 студэнты, 39 слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, 102 выкладчыкі і супрацоўнікі факультэта.**

Рэзка ўзрасла партыйная праслойка сярод студэнтаў I курса — тут 52 камуністы. У састаў партарганізацыі факультэта ўваходзяць 15 партыйных груп, з іх 6 студэнцкіх. Актыўна ўдзельнічаюць у партыйным жыцці камуністы грамадскіх кафедр: гісторыі КПСС, марксісцка-ленінскай філасофіі, палітычнай эканоміі, навуковага камунізму і іншых.

Гістарычны факультэт рыхтуе спецыялістаў па гісторыі, філасофіі і палітэканоміі. Партыйная арганізацыя мае дзве студэнцкія партыйныя групы на аддзяленнях філасофіі і палітэканоміі.

Было б мэтазгодным стварыць у пярвічнай арганізацыі цэхавыя партыйныя арганізацыі, што не пярэчыць Статуту КПСС. Такая структура пярвічнай арганізацыі дазволіць ёй забяспечыць актыўны, мэтанакіраваны і найбольш дзейны ўдзел кожнага камуніста ў партыйным жыцці, у рашэнні тых задач, якія стаяць перад ёй.

Дакладчык адзначыў, што гістарычны факультэт рыхтуе ідэалагічныя кадры; студэнты-выпускнікі накіроўваюцца на працу ў сярэднія школы, сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, паступаюць у аспірантуру. Сакратар партбюро выказаўся за тое, каб больш прымаць у партыю лепшых студэнтаў-актывістаў. Мы павінны прымаць у свае рады студэнтаў, адзначыў І. Марчанка, якія актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці, выдатна вучацца, ва ўсім з'яўляюцца прыкладам.

У заключэнне І. Марчанка заверыў партыйны сход, што камуністы гістарычнага факультэта з гонарам выканаюць задачы, пастаўленыя XXV з'ездам КПСС, унясуць свой дастойны ўклад у здзяйсненне велічных планаў дзесятай пяцігодкі.

***

Затым слова для выступлення было прадастаўлена намесніку сакратара партбюро філфака **Л. Максімавай,** якая расказала аб тым, як арганізуецца работа па вывучэнню і прапагандзе матэрыялаў XXV з'езда КПСС у партарганізацыі філалагічнага факультэта. Перш за ўсё гэта растлумачэнне гістарычных дакументаў партыі з удзелам у гэтай рабоце — акрамя выкладчыкаў факультэта — дэлегатаў з'езда, адказных партыйных і камсамольскіх работнікаў, работнікаў Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

**Для прапаганды рашэнняў з'езда на філфаку выкарыстоўваюцца розныя формы масава-палітычнай работы: цыклы лекцый, прэс-канферэнцыі, тэматычныя вечары, сустрэчы з творчымі работнікамі.**

Выступаючая адзначыла, што важна, каб кожны выкладчык, студэнт не проста ўсвядоміў веліч планаў партыі, задачы, якія стаяць перад краінай, а меў бы дакладнае ўяўленне аб тым, што ён павінен канкрэтна зрабіць сам для рашэння гэтых задач.

Затым Л. Максімава спынілася на пытаннях удасканалення вучэбнага працэсу, пошуку новых форм і метадаў работы са студэнтамі, на яшчэ не вырашаных праблемах арганізацыі навукова-даследчай работы.

Адным з важнейшых участкаў дзейнасці партбюро, як адзначыла выступаючая, з'яўляецца работа з камсамольцамі. Камсамольскі актыў факультэта імкнецца да таго, каб кожны студэнт вызначыў свой асабісты ўдзел у барацьбе за здзяйсненне планаў, намечаных партыяй. **У апошні час павысілася грамадска-палітычная актыўнасць камсамольцаў філфака. 98 працэнтаў студэнтаў маюць канкрэтнае камсамольскае даручэнне, кожны трэці студэнт — удзельнік мастацкай самадзейнасці. Толькі за перадз'ездаўскі перыяд і тры месяцы гэтага года студэнтамі прачытана 510 лекцый. Камсамольцы філфака выступілі перад рабочымі ВТА «Інтэграл», маторнага завода, перад працоўнымі сельскай гаспадаркі, школьнікамі.** У цяперашні час камсамольцы рыхтуюцца да злёту, які будзе праходзіць 9 мая ў Вязынцы, на радзіме Янкі Купалы. Падрыхтоўка да злёту ідзе пад дэвізам «Пяцігодцы эфектыўнасці і якасці — энтузіязм і творчасць маладых!».

Далей Л. Максімава адзначыла ўзрастаючую ролю крытыкі і самакрытыкі ў павышэнні дзейснасці работы партыйных арганізацый.

***

Загадчык кафедры ядзернай фізікі прафесар **С. Шушкевіч** у сваім выступленні адзначыў перш за ўсё тое, што выкладчыкі, работнікі ВНУ — адказныя за ўсе бакі фарміравання маладога спецыяліста, за яго ідэйную пераканананасць, прафесійную падрыхтоўку, за яго маральныя прынцыпы. Інтэграл чалавечых ведаў падвойваецца кожныя дзесяць — дванаццаць год. Асабліва бурна развіваюцца галіны фізікі, якія маюць у адпаведнасці з рашэннямі XXV з'езда КПСС важнае значэнне для прамысловасці нашай рэспублікі: электроніка, радыёфізіка, фізіка цвёрдага цела і паўправаднікоў.

Выкладчык ВНУ можа забяспечыць высокую якасць сваёй работы толькі ў тым выпадку, калі ён сам актыўна займаецца навуковымі даследаваннямі, знаходзіцца на перадавых пазіцыях сучаснай навукі. Дасягненні фізфака ў галіне падрыхтоўкі маладых спецыялістаў абумоўлены ў першую чаргу пастаноўкай навукова-даследчай работы на факультэце.

**Супрацоўнікі фізфака выканалі ў дзевятай пяцігодцы рад важных тэарэтычных распрацовак. Яны ўдзельнічалі ў стварэнні комплексаў для касмічных даследаванняў. Фізфак даўно выйшаў на ўсесаюзны ўзровень па спектраскапіі, люмінесцэнцыі, тэарэтычнай фізіцы. Зараз гэты спіс дапоўнен радыёфізікай, фізікай цвёрдага цела і паўправаднікоў, электронікай і інш.**

Дзелавыя кантакты з арганізацыямі і ўстановамі, у якія накіроўваюцца нашы выпускнікі, дазваляюць кафедрам улічваць спецыфіку такіх арганізацый, прыцягваць да чытання лекцый і да іншых форм вучэбнай работы вядучых спецыялістаў інстытутаў АН БССР, аб'яднання «Інтэграл» і іншых. Усё часцей у дыпломных работах на належным навуковым узроўні рашаюцца канкрэтныя задачы для інстытута ядзернай энергетыкі і іншых інстытутаў АН БССР, аб'яднання «Інтэграл» і іншых.

Як адзначыў С. Шушкевіч, рашэнні XXV з'езда КПСС абавязваюць нас комплексна рашаць пытанні выхавання, забяспечваць цеснае адзінства ідэйна-палітычнага, прафесійнага і маральнага выхавання. Абмеркаванне на паседжаннях парткома БДУ пытання аб ідэйнай накіраванасці лекцый па спецыяльных дысцыплінах — адно з вельмі карысных мерапрыемстваў, накіраваных на рашэнне гэтай задачы.

***

Рашэнне першачарговых навуковых праблем, паскарэнне ўкаранення вынікаў даследаванняў у народную гаспадарку краіны, як адзначыў у сваім выступленні начальнік навукова-даследчага аддзела універсітэта **А. Чалей,** з'яўляецца сёння актуальнай задачай нашай навукі.

Гэтыя дасягненні з'яўляюцца вынікам фундаментальных работ па вывучэнню распаўсюджання радыёхваль. Сёння кафедра неарганічнай хіміі пачынае шырокую работу па ўкараненню ў вытворчасць метадаў бяссрэбранай фатаграфіі. Гэта ёсць вынік фундаментальных даследаванняў па хіміі цвёрдага цела. Шырока вядомы работы вучоных універсітэта ў галіне спектраскапіі і люмінесцэнцыі, фізікі і хіміі вадкіх крышталяў, фізікі паўправаднікоў, хімічнай тэрмадынамікі. Гэтыя поспехі нам трэба сёння пашырыць і паглыбіць. Гэта асабліва важна яшчэ і таму, што наша навука, акрамя рашэння асабістых задач, павінна рашаць нашу галоўную праблему — садзейнічаць падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Бурныя тэмпы развіцця навукі, якія назіраліся ў апошнія дзесяць-пятнаццаць год, былі рысамі і нашай універсітэцкай навукі. **За гады дзевятай пяцігодкі аб'ём выканання гаспадарча-дагаворных навукова-даследчых работ павялічыўся прыкладна ў 2,4 раза. І калі сёння універсітэт бярэцца за выкананне гаспадарча-дагаворнай навукова-даследчай работы, трэба ўлічыць многа фактараў, бо зараз мы можам выбіраць адну работу з дзвюх-трох. Таму неабходна дапамога саветаў факультэтаў. Нам трэба тэрмінова прыступіць да фарміравання праблемных навуковых саветаў.**

Далей выступаючы адзначыў, што для таго, каб здзейсніць пераход ад экстэнсіўных да інтэнсіўных форм навуковай дзейнасці, патрабуецца перш за ўсё ўдасканальваць сістэму кіравання навуковымі даследаваннямі. Кіраванне навукай — гэта таксама навука. Перш за ўсё належыць наладзіць планаванне навуковых даследаванняў, у прыватнасці эканамічны і фінансавы яго бакі.

Важнай умовай паскарэння тэмпаў навукова-тэхнічнага прагрэсу з'яўляецца і скарачэнне тэрмінаў цыклу «даследаванне — вытворчасць». За гады дзевятай пяцігодкі ў народную гаспадарку былі ўкаранёны 243 распрацоўкі, атрыман эканамічны эфект у 10 млн. 690,2 тыс. рублёў. Канешне, гэта многа. Але сёння гэтага мала. Справа ў тым, што гэта былі разавыя ўкараненні. Зараз ва універсітэце створана і функцыяніруе вучэбна-навукова-вытворчае аб'яднанне БДУ — ВТА «Інтэграл».

Затым А. Чалей звярнуў увагу на ролю і значэнне спецыяльных канструктарскіх тэхнічных бюро ў паскарэнні ўкаранення вынікаў навуковых даследаванняў у народную гаспадарку.

***

Рашэнні XXV з'езда КПСС, падкрэсліў выступіўшы затым член ЦК КПБ, рэктар універсітэта У. Сікорскі, — баявая праграма партыі, усяго савецкага народа. Як і ўсе партыйныя арганізацыі, мы пастаянна будзем кіравацца імі ў сваёй практычнай дзейнасці. Ужо сёння нам важна ўсведаміць маштабнасць задач, якія паставіў з'езд, зразумець узровень тых выключна высокіх патрабаванняў, якія прад'яўляе ён да партыйных арганізацый, да кожнага камуніста.

Асэнсаваць гэтыя пытанні ў многім дапамог нам даклад, з якім выступіў на нашым партыйным сходзе першы сакратар Мінскага гаркома партыі таварыш У. Ляпёшкін, дэлегат XXV з'езда КПСС. Дакладчык глыбока прааналізаваў нашу дзейнасць, па заслугах адзначыў поспехі, справядліва пакрытыкаваў недахопы, сфармуляваў задачы на бліжэйшы час.

Важна, каб мы, у першую чаргу рэктарат, партком, партыйныя бюро і дэканаты, правільна рэагавалі на крытыку і прынялі меры па карэннаму паляпшэнню ўсёй нашай вучэбнай, навуковай і выхаваўчай работы. Па меры росту маштабаў і складанасці рашаемых задач, адзначаецца ў Справаздачы Цэнтральнага Камітэта XXV з'езду КПСС, строгі, крытычны падыход да ўсіх спраў набывае рашаючае значэнне.

Давер, павага да людзей павінны спалучацца з высокай патрабавальнасцю за даручаную справу. Гэта — закон усяго нашага жыцця. Усім нам, асабліва рэктарату і парткому, патрэбна ўсё зрабіць для таго, каб гэта патрабаванне з'езда стала нормай жыцця, паводзін кожнага члена нашага калектыву.

Партком і рэктарат за апошні час правялі значную работу па развіццю ў калектывах крытыкі і самакрытыкі, павышэнню ў супрацоўнікаў пачуцця адказнасці за даручаную справу. І гэта прынесла пэўныя вынікі. На жаль, у нас яшчэ маюць месца факты парушэння працоўнай дысцыпліны, нядбайных адносін да справы, адхілення ад норм нашай маралі. І, як ні дзіўна, яны не заўсёды атрымліваюць прынцыповую ацэнку ў пярвічных партыйных арганізацыях. Крытыка, калі яна і гучыць, часта не канкрэтная.

Пакуль не ва ўсіх нашых падраздзяленнях створана па-сапраўднаму творчая працоўная высокамаральная атмасфера, абстаноўка ўзаемнай патрабавальнасці і разам з тым добразычлівасці, аб чым справядліва было

Заканчэнне на 4-й стар.

